Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Орган Давід-Гарадоцкага РК КП(б)Б і Райвыканкома

№ 18 (22)
Панядзелак
2
красавіка
1945 года
Цана 15 кап.

ДЭЛЕГАТАМ 1-га РАЁННАГА З'ЕЗДА СЯЛЯН ШЧЫРАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ!

ПА—БОЛЬШЭВІЦКУ ПРАВЯДЗЁМ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ!

ДАБ'ЁМСЯ ВЫСОКАГА ЎРАДЖАЮ!

У СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б прынялі пастанову аб дзяржаўным плане развіцця сельскай гаспадаркі БССР на 1945 год.

„Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны камітэт КП(б)Б,—гаворыцца ў пастанове,—лічаць галоўнай задачай калгасаў, машына-трактарных станцый, соўгасаў, зямельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у галіне сельскай гаспадаркі—хутчэйшае аднаўленне і далейшае развіццё сельскай гаспадаркі рэспублікі з тым, каб у бліжэйшыя 2—3 годы забяспечыць аднаўленне даваенных размераў пасеўных плошчаў, павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавога збору збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў".

Ніжэй мы друкуем IV раздзел гэтай пастановы.

Аб мерапрыемствах па аднаўленню сельскай гаспадаркі Заходніх абласцей БССР

Соўнарком БССР і ЦК КП(б)Б абавязваюць партыйныя, совецкія і зямельныя органы заходніх абласцей БССР:

1. Ліквідаваць марудлівасць у вырашэнні важнейшага пытання ў сельскай гаспадарцы заходніх абласцей—надзяленні зямлёй беззямельных і малазямельных сялян.

Аднавіць ўстаноўленыя ў 1941 годзе совецкім урадам прадзельныя нормы землекарыстання на адзін сялянскі двор у заходніх абласцях БССР, у выніку чаго шматлікія масы беззямельных і малазямельных сялян заходніх абласцей павінны атрымаць у сваё карыстанне зямлю.

Вярнуць сялянам усю зямлю, атрыманую імі на аснове законаў совецкай улады ў перыяд 1939—41 г.г. і адабраную ў іх нямецкімі захопнікамі і іх саўдзельнікамі.

Правесці надзяленне сялян зямлёй, як палітычнае мерапрыемства, якое забяспечвае далейшае згуртаванне працоўных заходніх абласцей вакол органаў совецкай улады.

2. Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б) Беларусі ставяць перад совецкімі, партыйнымі і зямельнымі органамі заходніх абласцей БССР адну з важнейшых задач—расшырэнне пасеўных плошчаў, асабліва збожжавых культур, бульбы, пасеваў ільну, выкарыстанне пад узорванне ўсіх залежных і пераложных зямель і правядзенне сельскагаспадарчых работ на высокім агратэхнічным узроўні, які-б забяспечваў атрыманне высокіх ураджаяў.

3. Соўнарком ЕССР і ЦК КП(б) Беларусі звяртаюць увагу совецкіх, партыйных і зямельных органаў заходніх абласцей ЕССР на неабходнасць аказання ўсямернай дапамогі сялянскім бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам, якія аказаліся разаронымі ў выніку нямецкай акупацыі. Неабходна дапамагчы гэтым гаспадаркам падрыхтавацца і паспяхова правесці веснавую сяўбу.

Бясконным гаспадаркам аказаць дапамогу ў апрацоўцы зямлі, для чаго ва ўсіх раёнах аднавіць машына-трактарныя станцыі, адрамантаваць усе наяўныя трактары і арганізаваць машына-конныя пракатныя пункты, шырока арганізаваць сялянскую ўзаемадапамогу ў апрацоўцы і абсемяненні зямель.

Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі лічаць, што выкананне плана развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год з'яўляецца важнейшай ваенна-гаспадарчай задачай совецкіх, партыйных арганізацый, зямельных органаў, калгасаў, МТС і соўгасаў, комуністаў і комсамольцаў, аграномаў, калгаснікаў і калгасніц, сялян заходніх абласцей рабочых і служачых у справе забяспечання Чырвонай Арміі і насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасці сыравінай.

Прыступілі к сяўбе

ХОРСК. Сяляне Хорскага сельсовета прыступілі к веснавой сяўбе. Першым пасеяў авёс селянін Прыка Іван Якаўлевіч. У бліжэйшыя дні распачнуць сяўбу ранніх яравых на падсохшых участках і другія сяляне Хорскага сельсовета.

Л. З. Мазан.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КОМСАМОЛЬЦАЎ

Комсамольцы пярвічнай арганізацыі пры Лядзецкім сельсавеце на сваім сходзе рашылі аказаць усямерную дапамогу сем'ям франтавікоў у правядзенні веснавой сяўбы. Яны намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў га гэтаму пытанню, а таксама абмеркавалі якім сем'ям трэба дапамагчы.

Комсамольцы рашылі дапамагчы сям'і Амельчук Анны і Антановіч Бассы. У першай маецца 3 дзяцей, муж і сын у Чырвонай Арміі, а ў другай—4 дзяцей, няма каня.

Комсамольцы сваімі сіламі вывезуць гэтым гаспадаркам гной, узаруць глебу і пасеюць яравы клін. Недастаючае насенне будзе выдана з фонда, які створан пры сельсавеце.

Т. Магер.

У ФОНД ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ—СІРАТАМ

Працоўныя Веляміцкага сельсовета сабралі ў фонд дапамогі дзецям-сіратам звыш 75 пудоў збожжа і 1875 рублёў грошай.

Актыўны ўдзел у зборы сродкаў прымалі Аблаушка Захар І., Слуцкі Барыс Л.(в. Велямічы) і Лешкевіч Павел Д.(в. Ольпень).

А. Занкін.

КІНО—НА ВЁСКУ

Раённы аддзел кінофікацыі на гэтых днях атрымаў гукавую кіно-перасоўку. Яна прадназначана выключна для абслугоўвання насельніцтва вёсак.

Працоўныя раёна скора прагледзяць рад мастацкіх і гістарычных кіно-фільмаў.

В. Бруцкі.

Раённы партыйны сход

На адбыўшымся раённым партыйным сходзе абмяркоўвалася пытанне аб рэалізацыі пастановы ЦК ЗКП(б) аб палітычнай рабоце партыйных арганізацый сярод насельніцтва заходніх абласцей і пастаноў шостага пленума ЦК КП(б)Б. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў першы сакратар РК КП(б)Б тав. Севасцьянчык.

У змястоўным дакладзе тав. Севасцьянчык расказаў аб той рабоце, якую прарабіла раённая партыйная арганізацыя ў галіне аднаўлення народнай гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, і недахопах у правядзенні палітмасавай работы сярод насельніцтва, увязаўшы гэтыя пытанні з рашэннямі VI пленума ЦК КП(б)Б і далейшымі задачамі.

Дакладчык, адзначыўшы аб поспехах у выкананні плана хлебапастаўак, лесанарыхтовак і лесывывазак, асабліва падвергнуў крытыцы работу зямельных органаў, якія да гэтага часу не закончылі работу па звароту зямель малазямельным сялянскім гаспадаркам, адняты нямецкімі акупантамі.

—Усё яшчэ марудна,—указаў тав. Севасцьянчык,—ідзе будаўніцтва спаленых і разбураных дамоў. Слаба пастаўлена палітмасавая работа сярод насельніцтва.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі, у якіх выступіла 20 таварышоў.

Загадчык парткабінета тав. Дубіеў адзначыў, што РК КП(б)Б недастаткова займаўся пытаннем ідэйна—палітычнага выхавання камуністаў. Наведванне партыйнай школы дрэннае. Камуністы: Місюра, Шыш і другія не працуюць над вывучэннем „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)". „Яшчэ горш абстаіць справа,—адзначыў тав. Дубіеў,—з вывучэннем камуністамі асноў марксізма-ленінізма самастойна. Таварышы: Сімаценка, Харлан, Федасееў зусім не працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню".

Выступіўшы пракурор таварыш Зайцаў спыніўся на пытаннях узняцця рэвалюцыйнай пільнасці і барацьбы з падобнымі выпадкамі нарушэння рэволюцыйнай законнасці.

—Многія старшыні і сакратары сельскіх советаў,—зазначыў т. Зайцаў,—упершыню высунуты на гэтую работу. Іх трэба вучыць і дапамагаць ім у рабоце. Райвыканкам мала ўдзяляе ўвагі гэтай справе.

Аб рабоце агіткалектываў расказаў у сваім выступленні загадчык аддзела прапаганды і агітацыі райкома партыі таварыш Каваленка.

—Некаторыя кіраўнікі агіткалектываў,—сказаў т. Каваленка,—пусцілі работу з агітатарамі на самацёк. Выдзелены кіраўніком агіткалектыва на судаверфі т. Камісараў перадаручыў гэтую справу т. Папову, які ніякай работы не вядзе. Кіраўнік Велямінскага агіткалектыва т. Навалаеў не праводзіў сістэматычнай работы з агітатарамі і нават арганізацыйна не аформіў агіткалектыва. Нелепш працуе і Ольшанскі агіткалектыў, дзе кіраўніком т. Калеснік.

Раённы партыйны сход чакаў пачуць з выступлення сакратара РК ЛКСМБ т. Навалаева аб тым, як працуе раённая камсамольская арганізацыя, як яна на справе дапамагае партыйнай арганізацыі ў вырашэнні практычных задач, але аб гэтым нічога не было сказана.

—У раёне недастаткова ідзе падрыхтоўка к веснавой сяўбе,—указаў сакратар РК КП(б)Б т. Несцюк. Да гэтага часу РайЗА не арганізаваў паўсямесна работу кузняў, рамонт сельгасінвентара ў некаторых сельсоветах не распачат. Аднаўленне МТС праходзіць марудна. Партарганізацыя недастаткова займаецца аднаўленнем калгасаў і арганізацыйна гаспадарчым умацаваннем ужо адноўленых калгасаў. Да гэтага часу аднаўленне спаленых вёсак праходзіць самацёкам. Ні РайЗА, ні Райвыканком не займаюцца планіроўкай адбудоўваемых вёсак.

У канцы схода выступіў з прамовай прадстаўнік ОК КП(б)Б т. Гарбачэўскі.

Раённы партыйны сход прыняў разгорнутае рашэнне, ў якім адзначыў усе недахопы ў рабоце партарганізацыі, наметіў канкрэтныя мерапрыемствы па выкананню рашэнняў VI пленума ЦК КП(б)Б.

В. Калнін.

САБРАЛІ 3 ТОНЫ НАСЕННЯ

Створаны пры Аядзецкім сельсавеце насенны фонд для аказання дапамогі бессямянным гаспадаркам з кожным днём папаўняецца. Ужо сабрана 3 тоны сямян.

Збор сямян і засыпка насеннага фонда прадаўжаецца.

І. Страха.

За граніцай

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ САЮЗНІКАЎ

Лондан, 30 сакавіка (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр напаў 1400 амерыканскіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні прыкладна 900 знішчальнікаў зрабілі сёння налёт на ваенныя аб'екты ў Брэмене, Гамбургу і Вільгельмсгафене.

У ноч на 30 сакавіка авіяцыя саюзнікаў падвергла бамбардыроўцы Берлін і аб'екты ў паўднёва-заходняй Германіі.

ГАДРАЕЗНАСЦІ КАПІТУЛЯЦЫІ МАНГЕЙМА

ЛОНДАН, 29 сакавіка (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае затрыманае дастаўкай наведамленне свайго спецыяльнага карэспандэнта, які знаходзіцца з войскамі 7-ай амерыканскай арміі ў Мангейме, аб акалічнасцях, пры якіх быў занят Майнгейм—буйны прамысловы прырэйнскі горад, распаложаны супроць Людвігсхафена.

Мангейм, піша карэспандэнт, быў адан амерыканскай 44-й пяхотнай дывізіі па тэлефону. Амерыканскія часці, рассоўваючыся, ў паўночным напрамку, чым шчалі горад, вуліцу за вуліцай, калі амерыканскі салдат пачуў у адной з установ тэлефонны званок. Ён зняў трубку і ўчуў нерэвовы голас, які заявіў: „Я з'яўляюся адным з гарадскіх чыноўнікаў. Спыніце, калі ласка, стральбу, таму што ў Мангейме няма больш нямецкіх салдат".

Праз некалькі мінут бургамістр горада пацвердзіў па тэлефону заяву чыноўніка і здаў горад амерыканцам. Амерыканскі афіцэр загадаў яму аддаць загад аб тым, каб былі вывешаны белыя флагі. Праз некалькі мінут белыя флагі развіваліся па ўсяму Мангейму—першаму гораду ў свеце, які здаўся па тэлефону.

Адрас рэдакцыі: г. Давід-Гарадок, вул. Карла Маркса, 10. Адказны рэдактар А. Плаўчанка.